# БЕЛАРУСКІ КУТОК НА УКРАІНЕ: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ

Арбузаў А.Ц., кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
Лойка Т.В., кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Не згубілася ў вяках, не згінула на крутых паваротах гісторыі беларускае семя на ўкраінскай зямлі. Працягваюцца сувязі жыхароў двух раённых цэнтраў на Дняпры – горада Дуброўна Віцебскай вобласці і горада Днепрапятроўска на Украіне. У студзені 2012 г. старшыня Днепрапятроўскага раённага Савета Валянціна Прыймачэнка і старшыня Дубровенскага райвыканкама Анатоль Лукашоў падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне бізнэсу, культуры і самакіравання [1, с. 5].

Беларускую дэлегацыю прыняў выконваючы абавязкі старшыні Днепрапятроўскага абласнога Савета А. Адамскі, а каля будынка Сельскага Савета гасцей сустракалі мясцовыя жыхары сяла Сурска-Літоўскага. Юнакі і дзяўчаты ў прыгожых нацыянальных касцюмах, пад бой барабанаў і музыку цёпла віталі беларусаў як сваіх братоў, сустракалі з хлебам-соллю, падарункамі. Старшыня сельскага Савета Р. Андрэеў арганізаваў для членаў дэлегацыі знаёмства з сялом, яго мінулым і сучаснасцю. Беларусы пабывалі ў сярэдняй школе, дзе да Вялікай Айчыннай вайны выкладанне вялося на беларускай мове, пазнаёміліся з экспазіцыяй мясцовага школьнага краязнаўчага музея. Як жа здарылася, што беларусы з г. Дуброўна апынуліся на Украіне, каб “навестить родные места”?

Лёсавызначальныя падзеі для беларусаў пачаліся пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, калі ў 1772 г. да Расійскай імперыі была далучана ўсходняя частка беларускіх земель, а на ўкраінскай зямлі па Указу Кацярыны II у 1776 г. быў заснаваны горад, які з 1787 г. пачаў называцца ў яе гонар Екацярынаслаў-Кільчэўскі [2, с. 2]. Пазней, у 1794 г., у гэты горад былі перасялены беларускія працаўнікі разам з Дубровенскай суконнай фабрыкай. Так дубровенцы апынуліся на днепрапятроўскай зямлі [3, с. 152].

Паўднёваму напрамку сваёй палітыкі царскі ўрад надаваў асаблівую ўвагу. Там для аховы межаў будаваліся крэпасці, а таксама буйныя прамыслова-гаспадарчыя цэнтры. У ліку адных з першых і быў пабудаваны горад Екацярынаслаў (зараз Днепрапятроўск). Падарожнічаючы па поўдню краіны, Кацярына II

у пышнай абстаноўцы заклала горад свайго імя, які праз кароткі час стаў буйным прамысловым цэнтрам. У 1790 г. па волі Р.А. Пацёмкіна ў горадзе былі закладзены падмуркі трох капітальных каменных карпусоў першай суконнай фабрыкі.

На першы погляд можа здацца дзіўным, але на самой справе першая ў Расіі суконная мануфактура пад назвай Екацярынаслаўская працавала не на Украіне, а ў Беларусі ў 1786 – 1794 гг. у мястэчку Дуброўна Магілёўскай губерні (зараз горад Дуброўна Віцебскай вобласці). Раней Дубровенская суконная мануфактура, як і гадзіннікавая, і пазументная, належала графу Р.А. Пацёмкіну. У 1791 г. ён памёр і яго прадпрыемствы Кацярына II выкупіла ў дзяржаўную казну, а ў хуткім часе яны былі вывезены ў Екацярынаслаў і Віцебск. Адначасова ў сяле Купаўне пад Масквой функцыяніравала другая Екацярынаслаўская мануфактура – шаўковапанчошная.

Екацярынаслаў, як і іншыя прамысловыя ўскраіны імперыі, забяспечваўся рабочай сілай у асноўным за кошт цэнтральных губерняў, асабліва беларускіх, жыхары якіх адносіліся да ліку ненадзейных. Яны часцей за іншых браліся за зброю, каб аднавіць сваю гаспадарку, сваю дзяржаву Вялікае княства Літоўскае. І калі б краіны заносіліся ў Кнігу Гінеса, то Беларусь была б там першай, бо на працягу толькі аднаго сямідзесяцігоддзя з 1794 па 1864 гг. беларусы чатыры разы браліся за зброю, каб дамагчыся незалежнасці: у 1794 г. – у час паўстання пад кіраўніцтвам генерала Т. Касцюшкі ў Польшчы і палкоўніка Я. Ясінскага ў ВКЛ; у 1812 г. – паверыўшы абяцанням Напалеона аднавіць ВКЛ і часткова падтрымаўшы чужынца, затым у 1830-1831 гг. – зноў паўстанне за аднаўленне дзяржавы; у 1863-1864 гг. – у час паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, але безвынікова.

Можна выказаць здагадку, што і аршанцы, і дубровенцы падтрымалі паўстанне і імкненні Я. Ясінскага аднавіць ВКЛ і тым самым пазбавіцца ад няволі маскоўскіх чужынцаў. Менавіта тады, у 1794 г. суконная Дубровенская, на якой працавалі 300 чалавек прыгонных сялян, разам з шаўковапанчошнай Маскоўскай мануфактурай былі перавезены на ўкраінскую зямлю і размешчаны ў карпусах Екацярынаслаўскай фабрыкі. Магілёўскі губернатар Вязміцінаў паведаміў графу Зубаву, што сялянскія сем'і Дубровенскай суконнай фабрыкі "из прежних своих жилищ в

Екатеринославль отправлены” [6, с. 79]. Разам з абсталяваннем з Беларусі і Падмаскоўя былі прымусова пераселены сотні і сотні ткачоў, падручных, часальшчыкаў воўны і іншых прыгонных умельцаў. У першыя гады заснавання паселішча перасяленцаў не мела афіцыйнай назвы, але ўжо ў 1798 г. у дакументах згадваецца як казённая вёска Дубровенская, або, інакш, Слабада Сурская.

У сувязі з перавозам суконнай мануфактуры на Украіну эканамічнае і сацыяльна-бытавое развіццё мястэчка Дуброўна прыйшло ў заняпад. Услед за суконнай у 1794 г. у Віцебск былі перавезены гадзіннікавая мануфактура, а затым і піярская школа. Значна пагоршыліся ўмовы пражывання і нават умовы навучання ў прыватных дубровенскіх пансіёнах [3, с. 152]. Так ажыццяўлялася ў Расійскай імперыі “нацыянальная палітыка”.Назіралася толькі спецыфіка адміністратыўных або мясцовых патрабаванняў, якія дапамагалі царскаму ўраду, абапіраючыся на пануючую рускую нацыю, уцягнуць нярускае насельніцтва рэгіёнаў у імперскае жыццё.

Як жа абсталяваліся і прыжываліся нашы прашчуры, перасяленцы дубровеншчыны на ўкраінскай зямлі? Па прыбыцці на месца прызначэння беларускія працаўнікі, а іх было 292 майстравых і 205 фабрычных сялян, якія складалі 285 сямей з агульнай колькасцю 1792 чалавекі, спачатку былі размеркаваны сярод сем’яў мясцовага насельніцтва. У першыя гады жыцця на новым месцы становішча прамыславікоў-пересяленцаў было вельмі цяжкім. У рапарце ў Маскву дырэктар казённай фабрыкі Кнорынга адзначаў, што “жилье для переселенцев было плохое. Построенные 225 изб к весне не были обмазаны глиной, а крыши текли как решето. Яровой пшеницы очень мало им было отпущено, к тому же с опозданием, поэтому всё, что было посеяно, пропало и не дало урожая. А ржи прошлогодней из казны для их посевной досталось каждой семье только по полторы копы, которой не только на питание до будущего урожая не хватило, не говоря уж о посеве…» [8].

Частыя засухі, голад, недахоп паліва, цяжкая праца на палях і фабрыцы нярэдка станавіліся прычынамі смерці многіх з іх [2, с. 2]. Не выпадкова ўжо ў 1798 г., праз чатыры гады пасля перасялення туды беларусаў-ліцвінаў, у вёсцы налічвалася 232 двары з насельніцтвам 1200 чалавек, гэта значыць, меней на 500 чалавек.

Аднак вярнуца зноў на радзіму было немагчыма. Пастаянны склад рабочых фабрыкі быў звязаны ў першую чаргу з прымусовым характарам працы і замацаваннем рабочых за прадпрыемствам. Да апошніх дзён існавання фабрыкі на ёй сустракаліся сотні сем'яў "беларускай і вялікарускай пароды". Людзі старэлі, паміралі і да станка станавіліся іх дзеці, унукі, складваліся кадры патомных рабочых. Тут яны спалучалі працу на мясцовай фабрыцы з заняткамі сельскай гаспадаркай. І прыезжых, і мясцовых яе жыхароў прыпісалі да тамашняй падсобнай фабрыкі па ачыстцы воўны, цяжкія цюкі якой затым адпраўлялі ў Екацярынаслаў на суконную фабрыку. Тры славянскія народы, рускі, беларускі і ўкраінскі, аб'ядналіся ў армію екацярынаслаўскіх ткачоў, дасягнуўшую хутка ўнушальнай для таго часу лічбы – двух з паловай тысяч. У пачатку XIX ст. гэтыя працаўнікі складалі нямногім менш паловы агульнай колькасці жыхароў горада.

Сляды беларусаў на этнічнай карце Украіны можна знайсці таксама на Херсоншчыне, куды ў першай чвэрці XIX ст. былі перавезены беларускія сяляне з Бабылецкага староства Магілёўскай губерні. Беларусы Магілёўшчыны добраахвотна перасяліліся на землі паміж рэкамі Берда, Конскія Воды, Гайчул і заснавалі вёскі Бельманка, Цямрук, Гайчул і Гусарка. Дзякуючы працавітасці і ўпартасці, якія ўласцівы беларускаму нацыянальнаму менталітэту, гэтыя вёскі па тым часе лічыліся квітнеючымі, багацейшымі. І ўсё ж адной з буйнейшых, найбольш старой была і зараз застаецца вёска Сурска-Літоўская (былая Слабада Сурская). Размяшчаецца яна на берагах рэчкі Мокрая Сура (прыток Дняпра) на паўднёвым захадзе ў 7 км ад Днепрапятроўска. Плошча населенага пункту складае 1564 гектараў. Па стану на 01.01.2007 г. у сяле пражывала 4309 жыхароў. Калі спачатку сяло называлі Сурскай Слабадой па назве ракі Мокрая Сура, то крыху пазней за ім замацавалася назва фабрычнай Слабады Сурска-Літоўскай. У сярэдзіне XIX ст. назва населенага пункта была так і ўзаконена. У ёй адлюстроўваўся нацыянальны склад сяла – былых жыхароў Вялікага княства Літоўскага, якіх тады яшчэ называлі "ліцвінамі".

У далейшым разам з забудовай сялянскіх двароў ля ракі была пабудавана двухпавярховая фабрыка – філіял екацярынаслаўскай суконнай фабрыкі, да якой былі прыпісаны ўсе жыхары сяла. На фабрыцы рабочыя займаліся ачысткай і часаннем воўны на

машынах, а ў сябе вакол дома – земляробскай справай. Працавалі з цямна да цямна, каб пракарміць свае сем'і. У вольны час спявалі беларускія народныя песні. Разам з родным словам яны служылі доказам "жывучасці і сілы беларуса, які не згубіў, негледзячы на ўсе гістарычныя перавароты і цяжкасці, ганенні, свайго этнаграфічнага аблічча."

У сярэдзіне XIX ст. сяло Сурска-Літоўскае стала валасным цэнтрам, у склад якога ўваходзілі суседнія сёлы Краснаполле, Нова-Нікалаеўка, Сялецкае і Сурска-Клеўцэве. Рэформа 1861 г. садзейнічала развіццю капіталістычных адносін як у горадзе, так і на вёсцы. Не абыйшоў гэты працэс і сяло Сурска-Літоўскае. Частка вяскоўцаў хлынула ў горад [2, с. 2]. І ўсё ж насельніцтва беларускай вёскі павялічвалася, перш за ўсё, за кошт новай хвалі перасяленцаў з беларускіх зямель і цэнтральных губерняў.

Нягледзячы на тое, што ў 1837 г. казённая суконная фабрыка ў Екацярынаслаўе спыніла сваё існаванне, вёска Сурска-Літоўскае з карты ўкраінскай зямлі не знікла, як і суконная мануфактура на беларускай зямлі. У м. Дуброўна з 1901 г. на месцы суконнай мануфактуры была адкрыта новая фабрыка "Дняпроўская мануфактура". У наш час на месцы фабрыкі працуе Дубровенскі льнозавод [1, с. 5].

У Сурска-Літоўску з'явіліся новыя пабудовы, а колькасць насельніцтва толькі за перыяд з 1884 па 1898 гг. павялічылася з 1126 да 3568 чалавек. Але працэс развіцця капіталізма стрымлівалі перажыткі феадалізма і, перш за ўсё, сялянская абшчына. Да пачатку сталыпінскай рэформы ў вёсцы існавала кругавая парука, пры якой за неўплату даўгоў і падаткаў сялянамі адказвала ўся вясковая абшчына. Без яе згоды ніхто не мог выехаць з сяла на заробкі, нават, калі ён не мог пражыць з ураджая, атрыманага на сваёй зямлі [2, с. 2]. Пад цяжкай ношай падаткаў і даўгоў збяднелыя сяляне траплялі ў залежнасць ад памешчыкаў. Рэшткі прыгонніцтва ў сельскай гаспадарцы, расслаенне сялян на багатых і бедных сталі прычынай вострых класавых супярэчнасцяў і сутыкненняў.

Сяляне Сурска-Літоўскага падтрымлівалі сувязі з рабочымі Екацярынаслава і разам з імі прынялі актыўны ўдзел у першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1905-1907 гг. І хоць сялянскае паўстанне было падаўлена, а члены Сурска-Літоўскага валаснога камітэта былі арыштаваны, рэвалюцыйны настрой сялян

не быў зломлены [4, с. 2]. Канец прыгнёту царызма быў пакладзены Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыяй і ўсталяваннем Савецкай улады. У сакавіку 1918 г. была створана сельская рада, а ў другой палове 1920 г. – камітэт сялянскай беднаты і першая камсамольская арганізацыя. Затым у сакавіку 1922 г. створана і першая партыйная ячэйка. Жыхары сяла актыўна ўключыліся ў будаўніцтва новага жыцця. У краіне распачалася індустрыялізацыя прамысловасці і калектывізацыя сельскай гаспадаркі. У сяле было створана шэсць калгасаў, за поспехі ў працы яны былі занесены ў Кнігу Гонару Усесаюзнай выстаўкі народнай гаспадаркі СССР.

Цяжкія выпрабаванні прыйшлося вынесці ў часы Вялікай Айчыннай вайны ўсяму савецкаму насельніцтву, у тым ліку, і жыхарам сяла Сурска-Літоўскага, якія ўжо 18 жніўня 1941 г. трапілі пад уладу гітлераўцаў. Акупанты расстралялі камуністаў Кужэльнага І.Х., Карнавуха П.П., Дзібрына Х.А. і іншых патрыётаў-падпольшчыкаў. На катаржную працу ў Германію былі гвалтоўна вывезены 152 юных жыхароў сяла. Фашысты разграбілі калгасную маёмасць, тэхніку, жывёлу.

У барацьбе супраць акупантаў удзельнічалі 715 жыхароў Сурска-Літоўскага, з іх 169, амаль кожны чацвёрты, адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі, 248, кожны трэці, аддалі свае жыццё за Радзіму (5, с. 2). Воінам-вызваліцелям ад гітлераўцаў удзячныя жыхары сяла Сурска-Літоўскага ў 1958 г. узвялі помнік. Наогул, у вёсцы надаюць вялікую ўвагу ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі, памятаюць і ганарацца сваімі землякамі – удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны – генералам Галаўко А.С., воінамі Івановым І.І., Пракоф’евым І.К., Міхайлавым І.Я. і многімі іншымі.

Кожны жыхар вёскі ведае і з задавальненнем можа расказаць яшчэ пра аднаго земляка-беларуса, які праславіў не толькі Украіну, Беларусь, але і Расію. Гэта ўдзельнік першых двух палярных экспедыцый СССР да Паўночнага полюса, сапраўдны член Акадэміі мастацтваў СССР, народны мастак СССР, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Фёдар Паўлавіч Рашэтнікаў. Як у гады ваенных выпрабаванняў, так і на працоўных пляцоўках мастак заўсёды быў на перадавым краі барацьбы. Сваё майстэрства карыкатурыста ён заўсёды аддаваў агульнай справе – разгрому ворага, умацаванню дзяржавы. Рашэтнікаў Ф.П. з’яўляецца аўтарам сусветна вядомых карцін ”Зноў двойка”, “Прыбыў на канікулы”. У

свой час ён перадаў у падарунак школе роднага сяла двадцаць карцін, выстаўленных зараз у музеі, капітальна адрамантаваным да 100-годдзя з дня нараджэння мастака [7, с. 263].

Многа выхадцаў з Сурска-Літоўскага працуюць на кіруючых пасадах, вызначыліся ў розных сферах. Нашчадкамі былых перасяленцаў з дубровенскай зямлі з'яўляюцца Юрый Машненка, знакаміты канструктар касмічных апаратаў; дойлід Карнаух У.І. (Шчадроў), аўтар помнікаў "Скорбящая", устаноўленных у Днепрапятроўскім Палацы студэнтаў і на вуліцы Узбярэжная ў знак памяці аб загінуўшых воінах-інтэрнацыяналістах; Святлана Ісакава і Мікола Цярэньцеў – заслужаныя настаўнікі, дырэктары Днепрапятроўскіх ліцэяў; Таццяна Здор – дырэктар Днепрапятроўскага Дома настаўнікаў; Уладзімір Паўлаў – галоўны ўрач Днепрапятроўскай бальніцы; Філіпаў О.М. – кандыдат гістарычных навук, дацэнт Днепрапятроўскага нацыянальнага ўніверсітэта і інш. [7, с. 264, 265].

У нашчадкаў дубровеншчыны ў многіх у пашпарце ў графе "нацыянальнасць" стаіць запіс "беларус". Не страцілася на крутых паваротах гісторыі беларускае "зярнятка", моцныя карані пусціла яно на ўкраінскай зямлі і стала вясомым коласам на ніве Прыдняпроўя пад шчырым сонцам нашай агульнай планеты Зямля.

Працягваюцца і з кожным годам умацоўваюцца сяброўскія адносіны жыхароў сяла Сурска-Літоўскага з насельніцтвам дубровеншчыны. Калі ўзімку ўкраінскія беларусы сустракалі дэлегатаў з г. Дуброўна, то летам 2012 г. дубровенцы віталі ўкраінскіх беларусаў на прарадзіме сваіх прашчураў. У Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці адбыўся фестываль самадзейных мастацкіх калектываў Прыдняпроўя, у якім прыняў удзел і пераможца многіх раённых конкурсаў самадзейный калектыў хора "Здравушка" з сяла Сурска-Літоўскага.

Удзельнікі харавых калектываў Прыдняпроўя сустракаліся на дубровенскай зямлі з працоўнымі калектывамі сельскагаспадарчай вытворчасці. Калектыў "Здравушкі" выступіў з канцэртнай праграмай перад жыхарамі вескі Верамееўшчына – прарадзімы знакамітай касманаўткі Валянціны Церашковай. Госці пабывалі на палях крывавых баёў у гады Вялікай Айчыннай вайны, усклалі кветкі на могільніку "Мемарыял Рыленкі", дзе пахаваны каля тысячы байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі Савецкага Саюза.

Выкарыстаная літаратура

1 Дубровенские! Это из Украины? // Беларуская ніва. – 2012. – 9 лют.

2. На ўзмежках цвіла і выстаяла. // Дняпроўская праўда –1982. – 23 каст.

3. Памяць. Гіст. дак. хроніка Дубровенскага раёна. У 2-х кн. Кн 1. – Мінск: Паліграфафармленне, 1997. – 598 с.

4. На ўзмежках цвіла і выстаяла. // Дняпроўская праўда –1982.– 2 лістап.

5. На ўзмежках цвіла і выстаяла. – "Дняпроўская праўда" – № 134, 11 лістап. 1982.

6. Болбас, М.Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. – Мінск. Беларусь. – 221 с.

7. Беларусь: Энцыкл. даведнік / Беларуская Энцыклапедыя. Рэд. калегія: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск.: Беларуская Энцыклапедыя, 1995. – 800 с.

8. В центре Украины живут потомки дубровенцев. – http://www.dubrovno.by/&p7u55.Page7of8. Дата выхода 02.06.2013 г.

9. Гісторыя міст і сіл УССР. Дніпровська обласць. – Киів, 1969. – с. 260-265.

## ПЕРШАПРАХОДЗЕЦ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*(да 130-годдзя з дня нараджэння акадэміка Ластоўскага В.Ю.)*

Арбузаў А.Ц., кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Навуковай творчасцю акадэмік Вацлаў Юсцінавіч Ластоўскі пачаў займацца яшчэ да кастрычніка 1917 г. Яго першай кнігай быў падручнік для школы "Кароткая гісторыя Беларусі", якую ён напісаў ва ўзросце 27 гадоў і ўпершыню апублікаваў на старонках газеты "Наша Ніва" у 1910 г. Пазней яна неаднаразова выходзіла з друку асобнай кніжкай.

Вацлаў Юсцінавіч Ластоўскі быў вельмі цікавым чалавекам, з'яўляўся не толькі гісторыкам і пісьменнікам, але і грамадскім і палітычным деячом. Ён актыўна ўдзельнічаў у беларускім нацыянальна-культурным адраджэнні.

У гады правядзення ў БССР палітыкі беларусізацыі быў рэпрэсіраваны і ў 1938 г. загінуў. Усе яго навуковыя працы былі